# Талент, у нечым недагавораны

лёсе Валянціны Коўтун, надаўшы яе творчасці маштабнасць і агульнанацыянальную значнасць. Праца ж над укладаннем тома выбраных твораў пісьменніка заўсёды дае магчымасць заглыбіцца ў яго творчую індывідуальнасць, абяцае стаць цікавым літаратуразнаўчым і тэксталагічным падарожжам. Ну а своеасаблівай «дарожнай мапай» для мяне ў гэтым падарожжы ўжо быў мой артыкул пра Валянціну Коўтун, напісаны яшчэ ў 2011 годзе для часопіса «Наша вера», дзе я зрабіла спробу асэнсавання на той момант ужо завершанага творчага шляху. Гэты артыкул лёг у аснову маёй прадмовы для кнігазбораўскага выдання.

## Падарожжа ў сакральнае

Выправілася ў гэтае «літаратуразнаўчае падарожжа», перажываючы яго як цікавую прыгоду: перачытала прыжыццёвыя паэтычныя зборнікі Валянціны Коўтун, адкрыла для сябе яе апавяданні, па-новаму зірнула на раманы, закапалася ў артыкулы, раскіданыя па перыёдыцы, прагледзела перапіску... Шмат месяцаў правяла за вывучэннем багатага архіўнага фонду пісьменніцы, які зараз захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. У выніку той корпус твораў, які быў мною адабраны для выдання і найлепш, як мне здавалася, сведчыў пра шматграннасць выбітнага таленту




пісьменніцы, нашмат перавысіў магчымы аб'ём выдання. Таму, на жаль, прыйшлося яго істотна скарачаць. Аднак нават пасля гэтага том, на маю думку, паўнавартасна прадстаўляе творчую асобу Валянціны Коўтун.

## Шлях да высокага

Аснову зместу складае раман-дылогія «Крыж міласэрнасці», прысвечаны Алаізе Пашкевіч (Цётцы). У літаратурнай спадчыне В. Коўтун ёсць два завершаныя раманы: адзін ужо названы, другі — «Пакліканыя», прысвечаны святой ахоўніцы Беларусі Еўфрасінні Полацкай. Менавіта гэтыя дзве гістарычныя постаці вельмі моцна паўплывалі на пісьменніцу, літаральна не адпускалі яе творчае ўяўленне, выклікаючы да жыцця ўсё новыя вобразныя асэнсаванні ў розных жанрах і формах. У нашым выданні падалося слушным прадставіць поўнамаштабны вобраз Цёткі раманнай формай, а вобраз Еўфрасінні — у жанры драматычнай паэмы, або «першага беларускага нацыянальнага хрысціянскага эпасу», па вызначэнні самой аўтаркі. Дапаўняюць змест вершы, на жаль, вельмі нешматлікія, аднак і яны даюць адчуць вышыню паэтычнага таленту В. Коўтун, які вызначае адмысловая метафарычнасць, сімволіка сэнсаў, калі зямное пераліваецца ў нябеснае, а таксама выразная грамадзянская пазіцыя паэта-творцы, вуснамі якога прамаўляе сама Айчына ў сваім мінулым, цяперашнім і будучыні. Выразную старонку выдання склалі бліскучыя «ўспамінальныя» артыкулы В. Коўтун, прысвечаныя знаным пісьменнікам-сучаснікам, з якімі яна сябравала і якія сталі знакавымі постацямі сучаснага нацыябыцця беларусаў. Завяршае змястоўную частку кнігі пранікнёны артыкул пісьменніцы Хрысціны Лялько, якая дзеліцца сяброўскімі ўспамінамі пра Валянціну Коўтун і робіць важныя акцэнты ў асэнсаванні яе асобы і творчасці.

Спадзяюся, што ў абвешчаны сёлета Год гістарычнай памяці том выбраных твораў Валянціны Коўтун у серыі «Беларускі кнігазбор» стане належным падарункам беларускаму чытачу.

**Падрыхтавала Яна БУДОВІЧ**